**Музейны занятак – экскурсія**
**«Усё пра лапці - з гісторыі аднаго экспаната»**
**Народны комплексны краязнаўчы музей «Вытокі»**

**М. І. Храмлюк,**
кіраўнік народнага музея Лойкаўскай СШ Гродзенскага раёна

**Мэта:** даследаваць старадаўні абутак продкаў у нашым рэгіёне - лапці, іх практычнае і абрадавае значэнне,ужыванне ў фальклорных творах.

**Задачы:**

- пазнаёміць наведвальнікаў музея з сакрэтамі майстэрства мясцовых умельцаў;
- выявіць віды гэтага старадаўняга абутку, яго мясцовыя назвы;
- пазнаёміць вучняў з абрадавым значэннем гэтага абутку і выкарыстаннем яго ў сённяшні час;
- правесці конкурсы, гульні з аўдыторыяй слухачоў па тэме экскурсіі.

## Ход занятка

*Экскурсавод (прыцішаным голасам):*

– Прытаіўшыся, яна пачула, як скардзіўся на свой лёс стары лапаць суседу- абіяку (*сл. 3*):

– Вось ужо амаль 100 гадоў я праляжаў без патрэбы, а калісьці верай і праўдай служыў гаспадару.

– Ды і я ўжо даўно нікому не патрэбны, – адказаў абіяк, – але ,калі мы трапілі ў музей, значыць, пра нас не забыліся…

Гэта ,вядома, казка, якая мае працяг…

Добры дзень! Тэма нашай экскурсіі: «З гісторыі аднаго экспаната» (*сл.4*). Сёння я раскажу вам пра самы просты і старажытны абутак у жыцці нашых продкаў – лапці.

Гэты прадмет (*паказвае лапці і сл.5*) трапіў у наш музей з суседняй вёскі Ятвезь. Падчас экспедыцыі мы зайшлі ў хату да дзядулі Івана, якому было амаль 90 гадоў. У размове з ім мы спыталі: «А ці насілі ў вашай вёсцы раней лапці?».

Дзядуля адказаў: «Так,насілі! Дарэчы, гэта самы гігіенічны абутак: ваду прапускае, можна насіць у гразь і ў балота, практычны і нічога не каштуе. Лапці плёў мой бацька і я таксама ўмею».

Дзядуля прынёс нам пару лапцей і маленькія абіячкі, якія ён насіў у дзяцінстве (*сл.6*). Нам сёння нават цяжка ўявіць, што такі нязручны абутак калісьці ў дзяцінстве насілі нашы продкі, таму зараз лапці займаюць пачэснае месца на паліцы раздзела экспазіцыі «Промыслы і рамёствы».

Які ж абутак насілі жыхары нашай мясцовасці ў мінулым?

Гэта тэма мала даследавана, пісьмовых звестак няма. Аб гэтым нам паведалі старажылы. «Ніякі аксаміт і атлас не дасць назе такога пачуцця мяккасці, цеплыні, прасторы і пяшчоты, якую яна адчувае ў лапцях», – так сказаў яшчэ ў 1868 годзе І. Ярэміч.

Назва «лапаць» паходзіць ад праславянскага кораня «лапт» – нага. Лапці – лёгкі будзённы абутак. Іх плялі з пяньковых і льняных аборак, ліпавага ці лазовага лыка, бяросты, або шылі са скуры – сырамяці (*сл.8*). Скураныя лапці – пасталы ці поршні – рабілі з двух кавалкаў сырамяці, сшытых па перыферыі падэшвы.

З плецены́х найбольш прыстойна выглядалі лапці-пахлапні, якія рабіліся з глыбокімі круглымі насамі, высокімі запяткамі, кароткімі, ледзь прыкметнымі петлямі для раменьчыкаў (*сл.9*).

Лапці насілі летам з ільнянымі, а зімой з шарсцянымі анучкамі, якімі акуратна агортвалі нагу амаль да калена і сіметрычна фіксавалі аборкамі ці рамянямі (даўжынёй да 3 метраў), што прапускаліся праз вушкі лапцей (*сл.10*).

Лапці мелі не толькі практычнае, але і абрадавае значэнне.

Асобымі магічнымі функцыямі ў народных павер'ях надзяляліся старыя «бывалыя» лапці. Іх вывешвалі на хлявах, загародках і курыных гняздоўях дзеля яйцаноскасці. Імі акурвалі карову пасля ацёлу. Іх выкарыстоўвалі на наваселлі, «заманьваючы» дамавіка ў новую хату (*сл.11*).

Уся беларуская вёска круглы год хадзіла ў лапцях (*сл.12*).

Здаецца, что складанага нясе ў сабе тэма гісторыі лапця? А між тым, нават дакладны час з'яўлення лапцяў у жыцці нашых продкаў невядомы па сённяшні дзень.

Прынята лічыць, што лапці – адзін з самых старажытных відаў абутку. Ва ўсякім разе, касцяныя гаплікі для пляцення лапцяў археолагі знаходзяць нават на неалітычных стаянках. Можна меркаваць, што ўжо ў каменным стагоддзі людзі, магчыма, плялі абутак з раслінных валокнаў (*сл.13*).

Лапці былі распаўсюджаныя таксама ў рускіх, татараў, украінцаў, карэлаў, фінаў, чувашоў і іншых народаў.

А ці ведаеце вы, якія ж лапці насілі жыхары нашай мясцовасці? Дык вось слухайце і глядзіце!!! (*сл. 14*)

Вось лапці маляваныя, (*паказвае)* нікім яшчэ не надзяваныя! (*сл. 15*)

А вось плеценыя з лыка ядронага! (*паказвае*) (*сл.16*).

А вось лапці сувенірныя для інтэр'еру кватэрнага! (*паказвае) (сл. 17*).

У нас лапці ўсякага памеру – для гнома і Гулівера! (*сл. 18).*

Усё ад народных майстроў. Паглядзі – і будзь здароў!(*сл. 19*).

А зараз скажыце, калі ласка, што такое лапці? (*Адказ: плецены абутак, які мацаваўся да нагі з дапамогай вяровак-касічак, шнуркоў ці аборак*). Носім мы цяпер туфлі, басаножкі, красоўкі ды боцікі. А даўней нездарма казалі: «У дарогу ісці – 5 пар лапцяў сплясці».

Пра лапці складзена шмат прыказак, прымавак, жартоўных прыпевак. Вось, напрыклад: «Лапці плесці – не вуліцу месці». (*сл.20*)

А вось жартоўная плыпеўка: (*сл.21*)

Лапці мае,
Насы выстрачаны.
Не хацела я скакаць –
Самі выскачылі.

Напэўна, і вы ведаеце шмат прыпевак, прыказак, прымавак, казак пра лапці! *(Наведвальнікі музея ўспамінаюць прыказкі, прымаўкі, жартоўныя прыпеўкі.)*

У народзе лапці выслаўлялі, нават назвы ім давалі розныя, напрыклад, «шаптуны», «курпы», «крутцы». На гулянні і ў святы вясковыя дзяўчаты абувалі маляванкі з белага і ружовага вязанага лыка або тканіны. (*сл.22*)

А зараз я вам прапаную такія заданні: неабходна растлумачыць народныя выразы пра лапці. (*сл.23*)

Як вы разумееце такія выразы:

- ✓ Не вучачыся і лапця не спляцеш.
- ✓ Лапаць ведай лапця, а бот – бота.
- ✓ Не бярыся лапці плесць, не надзершы лыка.
- ✓ У дарогу ісці, пяць пар лапцяў сплесці.
- ✓ Адна нага ў лапці, другая ў боце.
- ✓ У лапаць тэлефанаваць.
- ✓ Гэта табе не лапаць сплесці.
- ✓ І мы не на руку лапаць абуваем.

Не для справы, не для славы
Працягваюцца забавы.
Конкурс новы,
Вам пакуль што не вядомы.

А называецца ён «Абуй лапці». Трэба паспрабаваць абуць лапаць, як гэта рабілі нашы продкі. Паспрабуйце, калі ласка! (*Адзін чалавек атрымлівае лапці, вяроўкі, анучы і спрабуе абуць лапці).*

А зараз звернем увагу, як выканана заданне. Як бачыце, правільна абуць лапці не зусім проста. Тут, як кажуць, спрыт патрэбен! (*сл. 24*)

Мы з вамі даведаліся пра самы просты старажытны абутак у жыцці нашых далёкіх продкаў – лапці (*сл. 25*).

Канешне, сёння яны выкарыстоўваюцца як рарытэтныя прадметы ў аздабленні памяшканняў, дачных газонаў і г. д. Але ж гэта наша мінуўшчына, і ведаць яе мы павінны (*сл.26*).

Усяго вам добрага і да новых сустрэч!



Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Лойкаўская сярэдняя школа»

# Народны комплексны краязнаўчы музей

# «В ы т о к і»




ΚΛΕΙΩ






Гісторыя аднаго экспаната
«Лапці»


















чуни
ЛЫКОВЫЕ































Дзякую за ўвагу!
Экскурсію правяла
Чарняўская Кацярына